Моя Родина – Беларусь

Лопатина Юлия

УО “Полоцкая государственная гимназия №1 имени Ф. Скорины”

5 “В”

# Я часцінка маёй Беларусі

Я – маленькая кропля з крыніцаў святых,
Што ваду жыватворную маюць,
І зярнятка з мільёнаў зярняткаў жывых,
Што багацце Радзімы складаюць.
Алесь Казека

**Я** сёння прысніла дзіўны сон. Нібы я маленькая кропелька, што лятае разам з хмаркай па неабсяжных прасторах нашай зямлі. Цёплы ветрык то набліжае нас да яе, то зноў аддаляе.

**Ч**амусьці спачатку малюнак не зусім выразны. А потым… Вось жа ён, “зялёны лісток на планеце зямля”! Здагадаліся? Так, гэта мая Беларусь.

**А** што ж незвычайнае можна ўбачыць тут? У першую чаргу, бачу блакітныя стужкі маленькіх і вялікіх рэк: і паўнаводнага Нёмана, і шырокай Прыпяці, і Дняпра, і, канечне ж, Заходняй Дзвіны, якая са старажытных часоў лічылася важным гандлёвым шляхом “з варагаў у грэкі”. Нібы вочы прыгожых дзяўчат, блішчаць на карце Беларусі азёры: авеяныя легендамі і паданнямі Нарач і Свіцязь, не менш загадкавыя Дрысвяты і Доўгае…

**С**толькі хараства тоіць у сабе беларуская прырода з яе багатым раслінным і жывёльным светам. Адна з візітных картак нашай краіны – пушчанскі ўладар зубр. Белы бусел – сімвал чысціні, а лясны жаваранкак з яго песняй, падобнай да булькання ручайка ці звону тонкага дарагога металу, - сімвал самабытнасці.

**Ц**аной вялікіх намаганняў многія віды раслін і жывёл захаваліся да гэтага часу. У Беларусі пяць запаведных тэрыторый, якія ахоўваюцца дзяржавай: Нацыянальны парк “Белавежская пушча”, Бярэзінскі біясферны запаведнік, Нацыянальны парк “Прыпяцкі”, Нацыянальны парк “Браслаўскія азёры”, Нацыянальны парк “Нарачанскі”.

**І** вось на “зялёным лістку” я бачу кропкі. Ёсць большыя, ёсць меншыя. Гэта нашы гарады, пасёлкі і вёскі. У цэнтры самая вялікая кропка – горад Мінск, сталіца нашай краіны.

**Н**абліжаюся яшчэ і бачу абрысы Нацыянальнай бібліятэкі, Тэатра оперы і балета, Палаца Рэспублікі, Акадэміі навук, шматлікіх універсітэтаў, тэатраў, музеяў…

**К**олькі таямніц, загадак і гісторый хавае ў сабе кожны горад і кожная вёска! Чаго толькі вартая гісторыя Нясвіжскага і Мірскага замкаў! А Каложская царква ў Гародні ці палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі!

**А**ле мой погляд спыняецца не на самай вялікай, але значнай кропцы, размешчанай на поўначы Беларусі. Так, я маю на ўвазе самы старажытны горад

нашай краіны, заснаваны ў 882 годзе, - Полацк. Я сама з гонарам нашу гордае імя — ПАЛАЧАНКА — і вельмі хачу, каб як мага больш людзей пабывала тут і судакранулася з тысячагадовай гісторыяй “горада над Дзвіной”.

**М**ой горад – гэта велічная Сафія і Спаса-Ефрасінеўская царква, за якімі стаяць асобы Усяслава Брачыслававіча і Ефрасінні Полацкай, гэта пачатак беларускага кнігадрукавання і Францыск Скарына, гэта былы езуіцкі калегіум, а зараз Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт…

**А**ле ж не заўсёды наша краіна была “зялёным лістком”. Былі перыяды, калі лісток ператвараўся ў чырвоны і нават чорны. Так, я маю на ўвазе гады Вялікай Айчыннай вайны, калі страшная фашысцкая навала пракацілася па ўсёй зямлі.

**Ё**сць звесткі, што Беларусь у вайне страціла больш за палову свайго нацыянальнага багацця. Было разбурана і спалена 209 гарадоў, 9200 вёсак. Але якія б ні былі матэрыяльныя страты, самае страшнае – гэта гібель людзей. Бесчалавечны сімвал злачынстваў гітлераўцаў – вёскі Хатынь, Дальва, Ала і многія іншыя.

Ва**Й**на не мінула і мой родны годар Полацк. Але, як і большасць беларусаў, мае землякі бясстрашна і мужна змагаліся з ворагам. Я ганаруся імёнамі маладой дзяўчыны Таццяны Марыненка, якую да смерці замучылі фашысты, Зінаіды Тусналобавай-Марчанка, медсястры, якая ў час вайны страціла абедзве рукі і нагі.

**Б**езумоўна, сёння мы жывём пад мірным небам у свабоднай і незалежнай краіне. Аднак трэба паматаць, што гэта вынік сумесных намаганняў усяго нашага народа: дзядоў і прадзедаў, якія цаной свайго жыцця здабывалі мір на зямлі, бацькоў, якія працуюць дзеля таго, каб мы маглі ўсебакова развівацца як асобы, і, канешне, нас саміх.

**Е**днасць думак, еднасць спраў, еднасць народа прывяла да таго, што сёння Беларусь – гэта краіна з развітай прамысловасцю і пазнавальнымі брэндамі. Заводы “Нафтан” і “Палімір” у Наваполацку, “Беларуськалій” у Салігорску, БелАЗ у Жодзіна, МАЗ у Мінску вядомыя далёка за межамі нашай краіны.

“**Л**епш адзін раз пакаштаваць, чым некалькі разоў паглядзець”, - так можна сказаць пра бабруйскі зефір і полацкія сыркі “Мішу”, пра цукеркі фабрык “Спартак” і “Камунарка”.

**А** я лячу з хмаркай… У кожным населеным пункце заўважаю чырвона-зялёны сцяг і герб з жытнімі каласамі, канюшынай і льном. Гэта сімвалы нашай суверэннай краіны.

**Р**адкі з гімна звіняць у маёй галаве: “Мы, беларусы – мірныя людзі…”

**У** мяне ёсць мара: вырасці, вывучыцца на ўрача і дапамагаць людзям, быць “сэрцам адданай роднай зямлі”.

**С**ёння я шмат раблю для гэтага: добра вучуся ў школе, з’яўляюся ўдзельнікам алімпіяды па беларускай мове, танцую ва ўзорным калектыве “Забава”, удзельнічаю ў розных даследчых праектах.

… **І** тут я разумею, што мая хмарка вось-вось пральецца на зямлю буйнымі кроплямі дажджу і я растваруся ў гэтай зямлі… Раптам я

прачнулася… Але зусім не засмуцілася, бо, па словах Алеся Казекі, **“гонар маю лічыцца часцінкаю я асвячонай зямлі беларусаў”.**